# БЕРАСЦЕЙШЧЫНА – ПЛЁННАЯ ГЛЕБА ДЛЯ ЗАСВАЕННЯ ТРАДЫЦЫЙ М. БАГДАНОВІЧА

*Борсук Ніна (Брэст)*

Цікавасць да творчасці М. Багдановіча ў беларускім літаратуразнаўстве і крытыцы ніколі не прападала, хоць часам па аб'ектыўных прычынах паслаблялася. Працяглы час спадчына М. Багдановіча і яго паслядоўнікаў была мішэнню для практыкаванняў ідэолагаў, па перакананні якіх усё нацыянальнае і агульначалавечае лічылася праявамі, шкоднымі рэвалюцыі і сацыялізму. Не маглі яны прыняць, ацаніць, зразумець творчасць паэта-гуманіста, філосафа, эстэта, адраджэнца, якая заўжды ўспрымалася як узор «гармоніі, цэласнасці, мастацкай дасканаласці» [11, с. 463]. Гэтую асаблівасць мастацкай манеры паэта тонка адчулі такія літаратуразнаўцы, як А. Лойка, І. Навуменка, Т. Чабан, М. Стральцоў, У. Конан, І. Багдановіч, Р. Бярозкін, М. Грынчык, І. Замоцін, М. Мушынскі, Л. Казыра і інш., якія ў сваіх даследаваннях прадставілі чытачу М. Багдановіча асобай неардынарнай, таленавітай, з бездакорным эстэтычным густам. «М. Багдановіча хвалявалі тыя ж самыя пытанні і супярэчнасці, што і ўсю тагачасную беларускую літаратуру, аднак у параўнанні з сучаснікамі, не кажучы ўжо аб папярэдніках, паэт шукаў новы пункт погляду, адным з першых у беларускай літаратуры імкнуўся перадаць аб'ектыўнае праз суб'ектыўнае, знешняе праз унутранае, сацыяльнае праз індывідуальнае, псіхалагічнае» [4, с. 227].

Атмасфера, што пануе ў грамадстве на пачатку новага тысячагоддзя, настойліва нагадвае мастакам пра неабходнасць звяртацца да традыцый, эстэтычных запаветаў М. Багдановіча, які высока цаніў чалавечую асобу. Да гонару берасцейскіх творцаў неабходна адзначыць, што наша зямля стала жыватворнаю глебаю для засваення і творчага развіцця традыцый беларускага класіка. Вышэй выказаныя думкі яскрава ілюструюць адказы паэтаў на пытанне: «Ці адчулі Вы ўплыў М. Багдановіча на сваю творчасць?» Вось некаторыя з іх:

*Алесь Каско.* Гамер і Пушкін … / Аддаю павагу. / Купалу, Багдановіча люблю.

*Мікола Пракаповіч.* Крыўдна, што мы не паспелі ні заўважыць, ні ўсвядоміць, як па нітачцы, па каліўцу распранапі нашы душы. Па-ранейшаму няўпэўнена топчамся мы ля падножжа той вяршыні, на якой засталіся М. Багдановіч, Я. Купала, У. Караткевіч, У. Калеснік… Яны пазначылі нам шлях. / Хадзема, сябры…

*Ніна Мацяш.* М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас … пасылаліся нам Богам. Сейбіты былі і ёсць, іх не адна ўжо й сотня, а поле беларускага менталітэту й дагэтуль няўробленае. Перачытваю творчую спадчыну М. Багдановіча і прама ў вочы сурова глядзіць сучаснасць і патрабуе адказу ад кожнага з нас… У душы надоўга, калі не

назаўсёды, застаецца тое высокае святло перамогі над адзінотай – хай сабе і часовай перамогі, – без якога ўвогуле няма «поўнай чары» жыцця.

*Зінаіда Дудзюк.* Мая творчая індывідуальнасць фарміравалася пад уплывам Я. Коласа. Да мяне гэты паэт прыйшоў яшчэ ў маленстве. У падлеткавым узросце захапілася М. Лермантавым. З творчасцю М. Багдановіча бліжэй пазнаёмілася, калі было ўжо за дваццаць. Харошы паэт! Вабіць тонкім лірызмам, глыбокім псіхалагізмам, адчуваннем беларускасці (М. Багдановіч заставаўся беларусам, нягледзячы ні на якое асяроддзе), хаця непасрэднага ўплыву паэта на сваю творчасць не адчула.

*Алесь Паплаўскі.* Творчасць М. Багдановіча вабіла мяне заўжды меладычнасцю радка. Як не дзіўна, але багдановічаўская «Зорка Венера» прыйшла да мяне песняй. Адзін з першых вершаў М. Багдановіча, які давялося прачытаць яшчэ ў школе і вывучыць на памяць, – «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі». Санетная форма, у якой напісаны дадзены паэтычны твор, з тых часоў не дае пакою. Часам спрабую свае сілы ў жанры санета, але пакуль што на суд чытача не выношу.

*Сяргей Амяльчук.* На пачатку творчага шляху ўразілі і сёння хвалююць жанравыя пошукі М. Багдановіча. Напісаныя мною трыялет, напаўсанет, – бясспрэчна, гэта пад уплывам беларускага класіка.

Як бачна, берасцейскія мастакі слова імкнуцца выявіць сваю творчасць, жыццёвую пазіцыю, мастакоўскую самасць па творчых набытках беларускага класіка. Прайшло амаль цэлае стагоддзе з часу, калі жыў і пісаў паэт, таму на сённяшні дзень вызначыць уплыў М. Багдановіча на сучасных паэтаў як у чыстым, «дыстыляваным» выглядзе, так і ў калектыўным літаратурным вопыце, які пастаянна абнаўляецца, даволі складана. Неабходна ўлічваць той факт, што сучасныя паэты звычайна ўбіраюць творчыя традыцыі непрыкметна для сябе, немэтанакіравана, інтуітыўна, бо паэзія М. Багдановіча жыве ў іх душы на сапраўды падсвядомым узроўні (назіраюцца прыклады і мэтанакіраванай далучанасці нашых сучаснікаў да традыцый М. Багдановіча). Па гэтай прычыне паэт проста не можа ўсвядоміць характар і ступень літаратурных уплываў, якія ён зведаў на працягу сваёй творчасці.

Нельга не ўлічваць і аб'ектыўныя прычыны. Па-першае, творчасць беларускага класіка М. Багдановіча была папулярнай у Заходняй Беларусі яшчэ ў 20–30-ыя гады. Яна шырока даследавалася заходнебеларускай крытыкай, у той час, як у Савецкай Беларусі былі спробы аднесці яе да разраду несугучных часу, а ў 30-ыя гады творчасць М. Багдановіча была аб'яўлена дэкадэнцкай, а таму і зусім непатрэбнай (А. Кучар, Л. Бэндэ, М. Байкоў). І. Дварчанін, А. Навіна, М. Гарэцкі, С. Грынкевіч беражліва ставіліся да асобы і спадчыны М. Багдановіча, іх высновы па вывучэнні творчасці беларускага класіка сугучны ацэнкам сучаснага багдановічазнаўства.

Заходнебеларуская літаратура (К. Сваяк, Н. Арсеннева, В. Ластоўскі) развівалася ў накірунку трансфармацыі нацыянальных ідэалаў у агульначалавечыя каштоўнасці, арыентавалася на раскрыццё эстэтычнай сутнасці, на засваенне вопыту сусветных літаратур. Гэта было, бясспрэчна каштоўным на фоне вульгарызацыі прынцыпаў сапраўднага мастацтва ў Савецкай Беларусі.

Па-другое, савецкая ўлада ўсталявалася на заходніх землях амаль на дваццаць гадоў пазней, чым на ўсходніх. Па гэтай прычыне ў заходнім рэгіёне пазней пачалася калектывізацыя, абеззямельванне селяніна, а значыць, і слабей была падкошана аснова годнасці асобы. Больш выразна выяўляецца ў характары заходнікаў адданасць працы, зямлі, сваяцтву. Заходнікі, як сцвярджаў У. Калеснік, «маюць гаспадарчую псіхалогію»

[5, с. 149]. І ў гэтым мы схільны бачыць вытокі філасофска-інтэлектуальнай плыні ў сучаснай берасцейскай паэзіі.

Па-трэцяе, нельга не ўлічваць, што Берасцейшчына – гэта састаўная частка Берасцейска-Пінскага Палесся, адметнага рэгіёна ў славянскім свеце. Характар беларуса гэтага рэгіёна фарміраваўся пад уплывам прыроды Палесся, светаадчування палешукоў. З дзяцінства паэты ўбіралі ў сваю свядомасць народны погляд на свет прыроды, у якім шмат чаго было ад паганства, калі чалавек успрымаў сябе маленькай часцінкай прыроды: «Язычнік я. Другой не маю веры» (М. Пракаповіч).

Па-чацвёртае, менталітэт заходнікаў вызначаецца сітуацыяй памежжа, пагранічча, пераходнасці, а стан яго душы можна ахарактарызаваць, як «стан чуйнай няўстойлівасці» (паводле М. Мішчанчука).

Услед за М. Багдановічам напружаную барацьбу супраць хаатычнай мітуслівасці ў свеце людства берасцейскія творцы распачынаюць з пазнання эстэтычнага вопыту нашых продкаў, вывучэння ўзаемасувязей чалавека і прыроды.

Сучасныя мастакі слова, як і іх папярэднік, духоўны настаўнік, усведамляюць чалавечае жыццё як найвялікшае шчасце і паэтычным словам вядуць барацьбу за чалавечыя душы.

Нельга абысці ўвагаю думку беларускага класіка пра асаблівае значэнне, якое набывае для развіцця нацыянальнай літаратуры зварот да набыткаў сусветнай культуры.

Засяродзімся на мэтазгоднасці і асноўных аспектах функцыянавання міфалагічных матываў у творчасці сучасных паэтаў. У цэнтры ўвагі мастакоў слова – асоба, здольная тонка адчуваць прыроду і чуйна ўспрымаць прыгожае ў свеце, асоба, якая імкнецца да гарманічных узаемаадносін з прыродаю і людзьмі. Міфалагічныя багдановічаўскія матывы ў творчасці сучаснікаў трансфармуюцца і ўзбагачаюцца. Яны паглыбляюць роздум аб змястоўнасці і гарманічнасці жыцця продкаў («Вогнішча» М. Рудкоўскага). Акрамя таго, традыцыйныя міфалагічныя матывы дапамагаюць сённяшнім паэтам увасобіць адраджэнскія ідэі («Няспешны, хвалісты палёт» М. Рудкоўскага, «Кава», «Мара» А. Дэбіша), перадаць боль, трывогу і заклапочанасць сучасным станам экалогіі, спусташэннем і выміраннем жывой прыроды («Сустрэча ў лесе» М. Рудкоўскага), а разам з гэтым – і спусташэннем людскіх душ («Чарнабог» А. Дэбіша, «Прыходзіў час» М. Пракаповіча). Міфалогія дазваляе нашым сучаснікам выйсці ў свет асэнсавання эстэтычных, этычных катэгорый народа («Майму паляўнічаму» З. Дудзюк, «Велямос» А. Дэбіша).

Асабліва паслядоўна прасочваецца творча-эстэтычная трансфармацыя міфалагічных матываў М. Багдановіча ў кнізе паэзіі А. Дэбіша «Стодзівы». З вераю ў чыстых, сумленных людзей жыве герой А. Дэбіша. Ён перасцерагае, што ў чалавечых душах запануе жудасная пачвара Чарнабога, калі людзі канчаткова згубяць надзею, калі стануць бязвольнымі, бяспамятнымі: «Тады прыходзіць ён – / і ў сэрцы смутак сее, / і дух не выпускае мой з ярма» (верш «Чарнабог»). Ён здольны ўчыніць здзек нават з самага светлага і чыстага – кахання, «святлом напоўніўшы чужым». І тады няўтульна, адчужана адчувае сябе чалавек у людскім асяроддзі: «Збавення я прашу ды гэта – марна… / І прэч я ад людзей бягу тады».

Нягледзячы на назву «Чарнабог», верш успрымаецца намі даволі аптымістычна: святло заўсёды перамагае цемру. Няма на свеце такіх перашкод, якія б засланілі высокім людскім душам шляхі да багоў светлаясных. Лірычны герой А. Дэбіша імкнецца жыць па законах дабрыні і міласэрнасці. Для сучаснага паэта зварот да міфалогіі

стаў той крыніцай, якая спаталяе вечную і непераможную чалавечую прагу літасці і справядлівасці, праўды і шчырасці, чысціні і хараства.

Тэму жыцця і смерці, якая хвалюе кожнага чалавека, паэт А. Дэбіш вырашае з гуманістычных пазіцый. Ён, як і нашы продкі, не жадае мірыцца са смерцю, спрабуе глядзець на яе, як на нейкі неабходны момант у кругазвароце жыцця: нараджэнне – жыццё – смерць – нараджэнне. Як бачна, зварот да матываў міфалогіі дапамагае сучасным паэтам глыбока асэнсаваць шляхі пераадолення трагізму быцця. А. Дэбіш у вершы «Велямос» нагадвае: перад смерцю ўсе роўныя. «А над усім, на троне – Велямос». Бог смерці стаіць над кожным: «над людзьмі, людцамі, рабамі, вяльможамі», таму пры жыцці людзі павінны абыходзіцца адзін з адным па законах чалавечнасці. Да такой маральнай высновы прыходзіць наш паэт-сучаснік.

Як і М. Багдановіч, які не прымаў жыцця-сну нямоглых русалак, вадзянікаў, бо для яго жыццё-існаванне было страшнейшым за смерць, лірычны герой зборніка «Стодзівы» А. Дэбіша не жадае прыслухоўвацца да замоў Мары, якая «ашчэраным ротам нашэптвае словы аб вечнай самоце». Жыццю-рабству А. Дэбіш супрацьпастаўляе самаахвярнае жыццё, калі нават гэта – жыццё-імгненне. Перад героем верша «Кава» паўстае выбар: альбо смерць са славай, альбо «быць заўжды папіхачом». У «безназоўны час» герой не спадзяецца на цуд. Здаецца, ён здольны ўжо прымірыцца са сваім лёсам. Але ў такія хвіліны да яго з'яўляецца бог Кава, які вызваляе яго рукі ад путаў, у душы сее зернейкі веры, надзяляе мужнасцю: «І сілу я адчуў, і рушыў / Туды, дзе жорсткі бой кіпеў… / і за сабою чуў я мужны, / Непераможны, зычны спеў!».

Жыццёвая пазіцыя лірычнага героя А. Дэбіша супадае з пазіцыяй самога аўтара зборніка «Стодзівы», для якога найгоршы здзек – жыць і памерці на каленях. Зусім відавочна, што міфалогія стала для А. Дэбіша тым «рэальным зямным грунтам пад нагамі» (паводле Т. Чабан), які дапамог паэту ў момант самага высокага духоўнага напружання далучыцца да асэнсавання маральных праблем сучаснага грамадства, пераадолець крызіс ваганняў і няпэўнасці ў душы сучасніка, спыніць хваробу абыякавасці, пасіўнасці, што даволі хутка распаўсюджваецца ў грамадстве. Услед за М. Багдановічам, якому ўдалося стварыць «на аснове нацыянальнай міфалогіі велічны «міф» аб зачараваным царстве народнага духу і яго непазбежным абуджэнні» [11, с. 474], А. Дэбіш сваім паэтычным зборнікам «Стодзівы» пераконвае чытача ў тым, што зварот да міфалогіі будзе спрыяць ачышчэнню «ад хлуду» не толькі лясоў, але і ад бруду «змярцвелых чалавечых душ» (верш «Зніч»).

Сучасная паэзія, у тым ліку і берасцейская, не разбурае традыцый М. Багдановіча, а, наадварот, дапаўняе і абнаўляе іх. Зварот да матываў міфалогіі, па нашым перакананні, – гэта моцны бок творчасці паэтаў, паказчык паглыблення інтэлектуальнасці і філасафізму ў сучаснай паэзіі, што, у сваю чаргу, з'яўляецца крыніцай абнаўлення літаратуры. «Па сутнасці міфы – гэта своеасаблівая філасофская паэзія» [12, с. 7]. Міфалагічныя матывы выкарыстоўваюцца паэтамі дзеля таго, каб прыцягнуць увагу чытача да надзённых агульначалавечых, нацыянальных, экалагічных праблем.

Яшчэ з 20-ых гадоў мінулага стагоддзя за М. Багдановічам замацавалася азначэнне «госць з высокага неба» (паводле У. Ігнатоўскага), «зоркапаклоннік» [11, с. 69]. Ва ўяўленні беларускага класіка неба, зямля, чалавек адзіныя. Шырыня і глыбіня гэтага яднання найбольш поўна выяўлены, па нашым перакананні, у наступных радках паэта: «Ціха ўсё было на небе, зямлі і на сэрцы» (верш «Ноч»).

Услед за М. Багдановічам наша сучасніца Н. Мацяш, адчуваючы тугу па страчанай гармоніі, таксама раіць: «Паглядвайма ў неба». Для герояў М. Рудкоўскага, З. Дудзюк, Н. Мацяш, М. Пракаповіча, А. Дэбіша матыў вышыні, неба – гэта шлях да духоўнага самаўдасканалення, да ажыццяўлення, здавалася б, самых неверагодных мар, да ўсведамлення сутнасных глыбінь быцця: «Да шчасця – праз церні, / праз гора – да зорак» (М. Рудкоўскі «Знікаю я і прападаю»). Крыўдна лірычнаму герою А. Каско, што ён не ведае шляхоў вызвалення ад духоўнай прыгнечанасці, што душа яго сучасніка не тое што да зорак – да ліхтароў не даляціць (верш «Папросіць вуліцу знайсці»).

Туга па страчанай гармоніі для гераіні З. Дудзюк асабліва абвастраецца ў вячэрні, начны час: «І я беспрытульна між зор халадзею» (верш «Самота скупая»). Душэўны боль сваёй гераіні паэтка ўзмацняе радкамі: «ноч тугі сляпой» (верш «Аднойчы гэта ўжо было»), «неба п'е тугу начамі» (верш «Надыдзе старасць»), «атрутную самоту піць начамі» (верш «Дзе возера закута белатой»), «смяротны дух начэй» (верш «Зноў я зусім бязвольная пры волі»). Тым не менш, вочы гераіні З. Дудзюк «прагна звернуты да неба, / Нібы палёгка стуль калі прыйшла» (верш «Зноў я зусім бязвольная пры волі»).

У малітве-санеце «Я лесвіцу ўзвяду да неба важна» лірычны герой В. Дэбіша, пераадольваючы дысгармонію жыцця, якая ўзмацняецца ў вершы праз словы «кпіны», «чужы», «нябачны», «незразумелы», «няўдзячны», звяртаецца да неба. Для яго – гэта «край дзіўны, недасяжны, / Дзе мір і радасць і шчаслівы кожны», у якім адчувальная прысутнасць мудрай думкі Божай. У яго радках мы не пачуем ні праклёнаў лёсу, ні папрокаў «на люд няўдзячны». Духам міласэрнасці да слабых, пакрыўджаных, разгубленых прасякнуты апошнія радкі санета: «Даруй ім, Бог. А я ім не суддзя. / Што з іх узяць, сляпых, глухіх і хворых… / Як яблыкі, страсаю з неба зоры». Як тут не прыгадаць М. Багдановіча, які не ўяўляў шлях да высокага без пакутаў, падзенняў. Нягледзячы на гэта, ён імкнуўся да святла, да красы: «Гляну ў неба і памру» (верш «Змяіны цар»).

Зорнае неба бласлаўляе каханне лірычных герояў З. Дудзюк («нас заручылі зоркі», «якая сінь зышла на нас з нябёс» – верш «Асцерагуся варажыць на лёс»), А. Каско («Цішыня. Нікога ў свеце. / Толькі неба… Нас няма…»), дапамагае пераадолець роспач («зоркі і тыя гняздэчкі ўюць» – верш М. Пракаповіча «Якою адмераць мерай»). Услед за М. Багдановічам, які быў перакананы, што апошнімі словамі чалавека будуць словы кахання, А. Дэбіш апявае несмяротнасць гэтага светлага пачуцця ў вершы «Кахаў… Як перуны хапаў». Пры расставанні з каханай лірычны герой верша, затаіўшы свае пачуцці, «успыхвае зоркаю». Ён становіцца дробнай часцінкай вечнага, высокага, магутнага, чыстага неба і адтуль праз цемру ночы, «слату дажджу» асвятляе шлях любай дзяўчыне. Эпіграф з Сюлі-Прудона, які выкарыстаў М. Багдановіч да раманса «Зорка Венера», можна было б суаднесці і з вышэй разгледжаным вершам А. Дэбіша.

Такім чынам, да спасціжэння гарманічных узаемаадносін з нябеснай красою імкнуцца і нашы сучаснікі, бо менавіта жыццё ў суладдзі з ёю і дапамагло ў свой час М. Багдановічу адчуць агульную карціну ўсяго існага, глыбокую паяднанасць чалавека з Космасам, Сусветам.

Верш М. Рудкоўскага «Я адчыняю ў ноч сваё акно» па сіле ўздзеяння на чытача, па глыбіні раскрыцця таемнага трыадзінства, што пануе ў прыродзе і якое здольны адчуць і ўбачыць «хіба толькі сам паэт» (М. Багдановіч), можна паставіць побач з вершам М. Багдановіча «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог». «З прыродай зліўшыся ў адно», лірычны герой М. Рудкоўскага адчувае свой «пульс і хваляванне – У травах, дрэвах,

месячным святле»: «Мне страшна быць у гэтай ночы лішнім – / з прыродай я зліваюся ў адно» (верш «Я адчыняю ў ноч сваё акно»).

Сіла эстэтычнага ўздзеяння зорнага начнога неба настолькі моцная, што, паводле метафарычнага выказвання М. Рудкоўскага, словы кладуцца на ліст паперы «зіхоткімі знічкамі» (верш «Словы»). Сапраўды, матыў зорнага неба напаўняе паэзію нашых сучаснікаў светлым ачышчальным лірызмам, высокім і вечным святлом.

Маладзік, спадарожнік лёсу М. Багдановіча, відавочна, не асацыіруецца з творчасцю ні З. Дудзюк, ні М. Пракаповіча, ні А. Каско, ні А. Дэбіша. Толькі час ад часу на жыццёвым шляху іх лірычных герояў сустракаецца вяшчун няшчасцяў, адзіноты, жыццёвых перашкод: «Два цені на сцяне: там дзве рукі спляліся, / І, нібы здрады знак, там месяц малады» («Трыпціх жаночага цела» А. Дэбіша). Аб няспраўджаных надзеях закаханых нагадвае поўня, што смяецца, «халадком адбіўшыся ў вачах» лірычнага героя М. Пракаповіча (верш «Вось і ўсё. Закончыўся раман…»). «Дрыготкі малюнак месячнай ночы / саступае прыглушаным гукам, / і болей нічога няма, апроч вузенькай цьмянай палоскі, / што ўсё яшчэ дзеліць акно, / і яблык, і нас / напалову». Праз гэты паэтычны вобраз А. Каско ў вершы «З двара на падвоканне» разважае аб нявечнасці кахання, хаця ён належыць да ліку тых, для каго надзея на шчасце, чаканне яго не саступае самому шчасцю: «А ўсё ж як міма пройдзеш ты? / Змаўчу, / Стрываю, / Пакланюся» (верш «Пачую кліч, убачу шлях»).

Перад тварам неба, зораў, «трапяткі і балючы дотык» якіх адчувае чытач разам з героямі З. Дудзюк, М. Пракаповіча, вырашаецца лёс Радзімы. М. Пракаповіч любіць свой народ і спачувае яму, змучанаму гадамі гістарычнай крыўды. Нават у небе ён бачыць адбітак трагічнай гісторыі свайго краю: «Не зорнае неба ўгары – гэта варожых набегаў кастры» (цыкл вершаў «Галасы берасцейскага дзядзінца»).

Зорнае неба стала сведкам самаахвярнай смерці мужных сыноў за вызваленне Бацькаўшчыны ад фашысцкіх захопнікаў у вершы З. Дудзюк «Зямныя зоркі». «Чырвоныя зоркі зямныя / з бетонных пліт вырастаюць. / Над кожнаю брацкай магілай, / Над кожным курганам ззяюць. / У здзіўленні неба: / «У Зямлі такія сузор'і!» Апошнімі двума радкамі З. Дудзюк падкрэслівае, што нябесная краса прайграе спаборніцтва з зямною красою, з духоўнай прыгажосцю людзей, што зрабілі свядомы выбар насустрач смерці дзеля захавання жыцця і міру на планеце Зямля. Яны – «наша памяць, наша гордасць, наша гора», іх жыццё-імгненне ўвасоблена ў чырвоных зорках над кожнай брацкай магілай, у нябесных зорах, пад вартаю якіх, як сцвярджае паэтка, знаходзіцца наш край.

Такім чынам, у вершы «Зямныя зоркі» З. Дудзюк сцвярджае высокую суаднесенасць, гарманічнае суіснаванне зямной і нябеснай красы: «Мая Зямля – жыхарка неба, / І людзі – неба жыхары. / Усё ў Сусвеце злітавана: / Жыццё і вечнасць, рух і час. / і лёс Зямлі, і зоркі дальняй / У чалавецтва на плячах».

З вобразам васілька, які яшчэ нашымі продкамі ўспрымаўся як пасланнік неба на зямлі, глыбока і моцна звязана паэтычнае светаўспрыманне М. Багдановіча і многіх сучасных творцаў. Зусім відавочна, што «васількі» матыў спатрэбіўся мастакам слова для сцверджання неаддзельнасці лёсу чалавека і лёсу Радзімы: «Як не выйду больш на васількі / Я парог – / Пагукай бязмежжа гэтых словаў / Чатырох» («Vita brevis. Patria eternis», «Васілёк» Н. Мацяш, «На чужыне» М. Багдановіча).

Нельга не заўважыць, што валошкавы колер становіцца важным чыннікам паміж лірычным героем і яго каханай у творчасці шэрагу маладых паэтаў, якія звярнуліся

да традыцый М. Багдановіча. Для героя трагедыйна-баладнага верша М. Пракаповіча «Марыя» галоўным у каханні застаецца духоўнасць і найвялікшае шчасце – памяць пра «сінь валошак», што «разліта ў жыце» і адбіваецца «у родных вачах».

Праз супастаўленне вобразаў кавыля і валошкі М. Пракаповіч асэнсоўвае маральна-этычную праблему вернасці і здрады, выяўляе сутнасць жыцця беларускага воя: «Змыюць кроў з зямлі дажджы і росы, / Ды гайдае летапісны час / Кавылі – / ў чужых вачах раскосых. / і валошкі – / ў Цітавых вачах» (цыкл вершаў «Мяжа надзеі»).

У эстэтычнай канцэпцыі М. Багдановіча і нашых сучаснікаў васілёк – гэта яшчэ і ўвасабленне духоўнага арыенціра беларусаў, душы народа, сімвал нацыянальнага мастацтва. Ні цяжкая праца, ні адарванасць ад Радзімы не знішчылі самаахвярную, шчырую, гасцінную, мяккую душу народа («Слуцкія ткачыхі» М. Багдановіча, «Наступнік мой, што на мяжы стагоддзяў…» З. Дудзюк). Вобраз кветкі васількавага колеру дапамагае рэалізаваць нашым сучаснікам філасофска-эстэтычныя ідэі аб духоўным удасканаленні асобы («У вераснёвым полі» Н. Мацяш), грамадства («Залежнасць» З. Дудзюк), аб пераемнасці лепшых традыцый свайго народа («У вянок Любе» Н. Мацяш).

М. Багдановіча з аднолькавай сілай вабіла хараство летняй, восеньскай, зімовай і вясновай прыроды. Зімовыя матывы ў творчасці беларускага класіка вызначаюцца шматграннасцю, глыбінёй асэнсавання, складаюць адметную старонку яго паэзіі. Яны вабяць сучаснікаў аптымістычным пачаткам. Зімовая прырода ўлівае ў хворыя грудзі паэта спакой (верш «Зімовая дарога»), бадзёрыць, узрушае лірычнага героя М. Багдановіча (вершы «Завіруха», «Падвей»), мацуе яго душэўныя сілы (верш «Зімой), часам выклікае сум («Зімовая дарога»), але ніколі не раздражняе, не даводзіць да адчаю.

Багдановічаўскі матыў радасці жыцця даволі адчувальны ў «зімовай» паэзіі берасцейцаў. Аб гэтым сведчыць назва верша А. Каско «Свята снегу». Першы снег асацыіруецца ва ўяўленні лірычнага героя з вясновай квеценню яблынь (верш «Мяккай, белай цішынёй»). Зімовы малюнак сцішвае яго душэўны боль: «І скруху, / і тайную крыўду / ў бяскрайніх снягах утаплю» (верш «Зіма з тваім імем…»). У паэзіі Н. Мацяш зіма «цвіце натхнёнай, апантанаю завеяй» (верш «Лякаюцца: вярнулася зіма…»), нават у час адчаю «шугае маем завіруха» (верш «Я люблю цябе…»). Снегапады гераіня Н. Мацяш лічыць роднымі, называе іх – «мае» (верш «Снегапад»).

Зімовая паэзія М. Багдановіча ў цэлым выпраменьвае святло, але ж часам аптымістычная мелодыя верша перарываецца сумнымі ноткамі: «сумна бомы гудзяць», «маркотныя месяца рожкі» (верш «Зімовая дарога»). Мінорны матыў узнікае ў гэтым вершы толькі як водгалас ранейшых перажыванняў. Тужлівым настроем прасякнуты верш М. Багдановіча «На глухіх вулках – ноч глухая». Прыродная стыхія, завіруха сінтэзуе і з'яву прыроды, і сацыяльныя працэсы, якія вызначаюцца супярэчлівасцю, што падкрэсліваецца кантэкстуальнымі антонімамі – стогн і смех. Лірычны герой верша не адчувае сябе ўтульна ў гарадской мітусні: «Ўвесь бледны, млосны прыхіліўся / Я ля ліхтарні да варот». Гул завірухі разрывае яго душу: «І вось той гул мне ў душу ўліўся». Не здольны прымірыць супярэчнасці горада М. Багдановіч і ў вершы «Завіруха», хаця гэты паэтычны твор у параўнанні з папярэднім вызначаецца аптымістычным пачаткам.

Трагічнай падсветкай вызначаюцца зімовыя вершы нашых сучаснікаў. Гэтая думка, на наш погляд, яскрава ўвасоблена ў паэтычных радках З. Дудзюк: «Усё са срэбра, зрэб'я і марозу», «жалобнае выццё завірух» (верш «Адлучаю цябе ад кахання»), «адгаравала, выцвіла зямля. / Да белаты адбеленае поле» (верш «Адгаравала, выцвіла

зямля»); А. Каско – «ніякі снег» (верш «Сняжыцца прыцемак. Са мной нікога»); Н. Мацяш – «на вуліцы вядзьмарыць завіруха», «над светам белым / Драпежна сцюжа кружыць» (верш «Студзеньскі ліст»). Мінорны настрой не становіцца пануючым у паэзіі сучаснікаў. Праз судакрананне з паэзіяй як М. Багдановіча, так і сучасных паэтаў заўсёды застаецца ў душы чытача прывабнае святло, здольнасць прыняць і ўлавіць жыццё ў яго кантрастах. Спашлёмся на паэтычныя радкі З. Дудзюк: «Усё, што бачыш, душою прымі» (верш «Холад космасу, веліч зімы»); Н. Мацяш: «Багаслаўляю лета і зіму!» (верш «Я думала, люблю адну вясну»).

Лірычны герой А. Каско – рамантычная натура. Ён верыць «у свята – вітанне снягоў». «Добры дзень» – шчыра звяртаецца лірычны герой верша «Свята снегу» да прыроды. Тут відавочнае творча-эстэтычнае судакрананне нашага сучасніка з М. Багдановічам, які адухаўляў прыроду і вітаў яе, як блізкага сябра: «Здароў, марозны, звонкі вечар», «здароў, скрыпучы, мяккі снег». Як бачна, яднанню асобы са светам прыроды спрыяе такі мастацкі троп, як метафара, а дакладней яе разнавіднасць – персаніфікацыя.

У зімовых вершах А. Каско паглыбляецца матыў таемнага трыадзінства ўсяго, што «на небе, зямлі і на сэрцы». Успрыняты аўгарам, адчуты, убачаны ім снег яднае высокае і зямное і становіцца набыткам чалавека (верш «Ты, старонка, – сама цішыня…»). Тэма яднання зямной і нябеснай красы ў зімовай паэзіі М. Багдановіча найбольш поўна, па нашым перакананні, раскрыта ў другой страфе верша «Зімовая дарога». Блізкія да паэтычнай карціны класіка радкі з А. Каско: «Стала ціха, і месячык глянуў. / Гурбы снегу вятры намялі. / Голлі дрэў – сотні рук веліканаў – / пасвятлелае неба ўзнялі» (верш «Стала ціха, і месячык глянуў»).

З прыходам у беларускую паэзію М. Багдановіча «наша літаратура адкрыла эстэтыку начнога і зімовага іпастасяў быцця» [8, с. 94]. Для паэта зімовы час – гэта час пошуку чалавекам унутраных сіл, каб пераадолець хаос распаду, што пануе ў чалавечых душах, каб падрыхтавацца да сустрэчы вясны. «Адраджэнне прыроды ў М. Багдановіча не звязана з яе веснавым абуджэннем. Яно пачынаецца ў чалавечай душы як надзея, прадчуванне» [11, 1, с. 482].

Гэтая багдановічаўская традыцыя знаходзіць свой працяг у творчасці мастакоў слова Берасцейшчыны. Яскравы доказ гэтаму – верш А. Дэбіша «Зімовых вечароў сняжок згусцелы»: знямелыя вуліцы, у «шале ветру» дрыжаць дрэвы, уся прырода «захутана ў снегавейны вэлюм – а да святла памкнуўся дух збалелы». Герой перакананы, што вясновая пара ў сваю чаргу дасць яму сілы для духоўнага ўдасканалення, для адраджэння яго роднай Бацькаўшчыны: «Узыдзе сонца ранкам веснім / мой край, я веру, – уваскрэсне. / з ім я ўваскрэсну назаўжды».

«Сваю ўладу святкуюць раскутыя маразы» (верш «Паварот на лета»), але гераіня Н. Мацяш адчувае набліжэнне цеплыні і па-жаноцку чула імкнецца наблізіць і сустрэць чарговы жыццёвы віток (верш «Жанчына вясну прыручала»). Гэта яскрава прасочваецца праз вобраз галінкі, счарнелай ад маразоў. Дзякуючы цеплыні жаночых рук і жаночаму спагадліваму сэрцу, «белым суквеццем пра шчасце» крычала галінка. Як бачна, паэтка пераконвае чытача, што падсвядомае імкненне да гармоніі і дасканаласці, якое павінна быць замацаваным у глыбінях чалавечага сэрца, будзе спрыяць прыроднаму абуджэнню. Н. Мацяш нагадвае, што непарыўная повязь чалавека і прыроды ляжыць у аснове светабудовы, народнай свядомасці і ў гуманістычнай этыцы і эстэтыцы.

Інакш пачувае сябе зімой герой А. Каско. Сваё адраджэнне ён звязвае з вясновай парой. Але чаму ж «на плёсах свежасці і чысціні» (верш «З гадоў былых…»), як

прыгожа называе паэт вясновую пару, «зямля чаканнем веснім душы не апякла»? Ці не таму, што ён маўчаў узімку, і як вынік – «здранцвела яго слова ў халады». Герой верша «Цяпер працягнецца маўчанне» аказаўся непадрыхтаваным да вясновага абуджэння. Ён сурова пакараны: «Ты выбухнуць хацеў бы словам, / якога больш няма». Як бачым, тэма-вобраз зімы дапамагае А. Каско ў выяўленні грамадзянскай пазіцыі.

Услед за класікам сучасныя паэты выразна ўсведамляюць: перш, чым зразумець тую ці іншую ісціну, чалавек павінен убачыць, адчуць яе значнасць у форме прыгожага, што ў сваю чаргу будзе спрыяць фарміраванню гуманістычнай асобы. Заслуга М. Багдановіча яшчэ і ў тым, што ён вучыць нашых сучаснікаў «адбіраць для вобразнага пераўвасаблення нібыта ўсё другараднае, тое, што іншыя проста не заўважалі, і ствараць цудоўную лірычную гармонію» [2, с. 47].

Прырода, уведзеная ў эстэтычны культ М. Багдановічам, і на сённяшні дзень з'яўляецца крыніцай натхнення для многіх сучасных паэтаў, якія ўслед за беларускім класікам праз зварот да міфалогіі, праз асэнсаванне тэмы знітаванасці зямной і нябеснай красы, «эстэтыкі зімовай іпастасі быцця» асобы імкнуцца духоўна аб'яднаць людзей у часе і прасторы, пераадолець манкурцтва, абудзіць гістарычную памяць, спрыяюць фарміраванню ў чытача аптымістычнага светаўспрымання, эмацыянальнай чуйнасці, душэўнай далікатнасці і вытанчанасці, дапамагаюць людзям адчуць сябе грамадзянамі Светабудовы, Космасу («космас» у перакладзе з грэчаскай мовы «краса», «парадак», «упарадкаванне»).

Духоўны ідэал М. Багдановіча – гэта гарманічна развітая асоба, а не бязлікі натоўп. «У жыцці грамадства ёсць перыяды, калі этычнае і эстэтычнае збліжаюцца, а ёсць моманты іх аддалення. Збліжэнне наступае тады, калі абнаўляецца грамадства і ўся сістэма каштоўнасцей знаходзіцца ў руху, а ў часы застояў краса і дабро разыходзяцца, краса становіцца геданістычнай і распуснай, а мараль – драпежнай і цынічнай» [6, с. 8]. Вось чаму сучасная паэзія не застаецца абыякавай да філасофскага роздуму паэта-гуманіста над жыццём, над будучым чалавецтва: «Жыві, і цэльнасці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай» (верш «Жывеш не вечна, чалавек»); «Усё знікае, праходзіць як дым, / Светлы ж след будзе вечна жывым» (верш «С. Е. Палуяну»); «Проці цячэння вады / Зможа толькі жывое паплыць, / Хвалі ж ракі заўсягды / Тое цянуць, што скончыла жыць» (верш «Рушымся, брацця, хутчэй»).

М. Багдановіч першым у беларускай паэзіі ўславіў рыцарскія адносіны да жанчыны. Яго лірычны герой адчувае сябе сціплым, адданым слугою «цёмнавокай пані» (верш «Цёмнавокая пані, канец!»), называе яе «царицей дум его» (верш «Зелёная любовь»). Мадонна паходзіць ад італьянскага madonna, скарочанае ад mia donna – мая пані. Свае паводзіны лірычны герой М. Багдановіча вызначае наступным чынам: «Буду сніць і днямі, і начамі. / і прыду. Што ўздумаеш, (рабі). / Хочаш – душу растапчы нагамі, / Хочаш – мучай, хочаш – загубі» (верш «Буду сніць і днямі, і начамі»). Да жанчыны ён звяртаецца з асаблівай павагай, на «Вы». Нельга не заўважыць, што ўжыты займеннік пішацца з вялікай літары: «Я – непрыкметны, шэры чалавек. / Але Вамі, толькі Вамі паўна мая душа» (верш «Я – непрыкметны, шэры чалавек»). Паэт дазваляе сабе будзённае «ты» ў звароце да дзяўчыны толькі ў вершах, асабістых.

Пад уплывам М. Багдановіча нараджаецца ў паэзіі нашага сучасніка В. Вашэкі вобраз «каханай Пані» (верш «Танга»), «цудоўнай пані» (верш «Цудоўная пані»): «А я, блаславёны, нізка схілюся / Над мілай рукою, такой трапяткой. / Каханая Пані, дай толькі літання, / Каханая Пані, будзь вечна са мной!». «Пані яснавокай» прысвячае

сване вершы і В. Дэбіш («Прысвячэнні»). Пакорным слугою сваёй абранніцы становіцца лірычны герой А. Дэбіша (верш «Жадаю»): «Няхай усё – як сон, ілюзія, падман, / Але жадаю цалаваць твой твар і стан, / Быць знішчаным табой, не страціўшы жадання». Пачуццё пакланення перад каханай выявілі праз займеннік «Вы» В. Вабішчэвіч (верш «Вы мне падарылі вечар»), В. Барысюк (верш «Не будзе спаткання, не будзе абдымкаў») і інш.

Нельга не пагадзіцца, што творы многіх сучасных паэтаў вабяць ачышчальнай споведдзю аб дарагіх, незабыўных матулях. Тым не менш, назіраць адданасць, пяшчоту маці мы звыклі. Зусім іншае, калі мацярынства выступае ў абліччы маленькай дзяўчынкі. М. Багдановіч быў адным з першых, хто прадставіў чытачу вобраз дзяўчынкі-Мадонны.

У вершаваным апавяданні «У вёсцы» паэт малюе вобраз «дзяўчынкі ўпэцканай, і хілай, і худой». Здавалася б, яе нязграбная знешнасць павінна выклікаць у М. Багдановіча адчуванне самоты і безвыходнасці. Але для паэта-эстэта гэта неістотнае. З асаблівай пяшчотай М. Багдановіч апісвае, як дзяўчынка нахілілася да свайго заплаканага двухгадовага браціка, каб супакоіць яго. У гэтыя хвіліны яе аблічча вырастае ва ўяўленні чытача да высокага вобраза Мадонны. Змест вершаванага апавядання «У вёсцы» сугучны апавяданням «Марына», «Мадонна». У кожным з іх ролю маці-суцяшальніцы бярэ на сябе маленькая дзяўчынка, якая, здавалася, свяцілася быццам знутры «задушевной внимательностью к детям, готовностью всегда уберечь, защитить, ответ за них на себя взять». М. Багдановіч, як бачна, здолеў заўважыць у звычайнай вясковай дзяўчынцы тую найвышэйшую красу, што «Рафаэль вялікі / Стараўся выявіць праз маці божай лікі».

Такім чынам, паэт сцвярджае, што хараство неадлучна ад такіх паняццяў, як дабро, міласэрнасць, спагада. Праз параўнальнае супастаўленне (як «схіляецца ад ветру верх бярозкі», так «дзяўчынка к хлопчыку нагнулася») М. Багдановіч паглыбляе выказаную думку, узлаўляе мацярынскія пачуцці: «І саліваліся ў жывы абраз ядыны / Той выгляд мацеры ды з воблікам дзяўчыны – / Дзіцячым, цененькім; і ў гэты час яна, / Здавалася, была аж да краёў паўна / Якойсь шырокаю, радзімаю красою». Бяроза, як вядома, у народна-філасофскім уяўленні беларусаў з'яўляецца дрэвам мудрасці і пяшчоты, дабрыні, спагады. Нашы продкі здаўна лічылі, што бяроза супакойвае чалавека, здымае нагавор і ўспрымалі яе сімвалам чысціні, прыгажосці. Несумненна, што менавіта такім быў погляд М. Багдановіча і многіх яго паслядоўнікаў на гэтае дрэва.

Ва ўяўленні Н. Мацяш матуліна сэрца, у якім пакутліва варочаецца «свет гэты белы», мае абрысы лісточка бярозавага (верш «Заканамернасць»). Ва ўражлівай душы М. Купрэева бярозка ўбірае ў сябе памяць аб матулі, якая была закатавана паліцаямі ў час вайны (верш «Мілая бярозка, не бядуй…»).

Найбольш поўна, на наш погляд, спасціг і выявіў у сваёй творчасці канцэпцыю М. Багдановіча М. Рудкоўскі. «Тайна ідэальнай прыгажосці жанчыны, альбо сакрэт Мадонны, – гэта штодзённая містэрыя, у якой лучацца ў адно аблічча маці, сястра і дзіця»[8, с. 133].

У вершы «Метамарфозы» ў вобразе Мадонны паэт паказаў зямную жанчыну, суседскую дзяўчыну Марылю. Яна прываблівае душэўнай адкрытасцю, прыгажосцю сваіх мараў, трываласцю жыццялюбства, сілай і багаццем духоўнай энергіі. Назіраючы за паводзінамі гераіні (як яна ўзяла хлапчаня на рукі, як «беражліва і светла яго да грудзей прытуліла»), паэт заўважае ў ёй высакародныя рысы будучай маці. Гэта дае яму права наблізіць сваю гераіню да біблейскага вобраза дзевы Марыі. «Паводле хрысціянскай

дагматыкі, заснаванай на евангельскім пісанні, Мадонна – цнатлівая маці-дзяўчына, нарадзіла Ісуса Хрыста ад святога Духа без парушэння цнатлівасці. М. Багдановіч схіляўся да свецкага тлумачэння гэтага вобраза, маючы на ўвазе яго ўвасабленне ў гуманістычным мастацтве эпохі Рэнесансу» [8, с. 153]. Менавіта Багдановічаў падыход да вобраза дзевы Марыі імпанаваў паэту М. Рудкоўскаму. Сэнс чалавечага існавання ён, як і М. Багдановіч, бачыць у перамозе красы і дабрыні. М. Рудкоўскі, як і яго папярэднік, здымае супярэчнасці паміж знешняй і ўнутранай красою. Праз вобраз Мадонны М. Рудкоўскі («Метамарфозы») імкнецца прымірыць супярэчнасці паміж мараю аб міры, шчаслівым жыцці і прозаю жыцця («На зямлі – папялішчы. І холад. / Усё апусцела / Мёртвы – быццам жывы, / а жывы… а жывы – як святы»), дысгармонію паміж нябесным і зямным («Сумяшчэнне падзей! / Сумяшчэнне зямлі і нябёсаў»).

Як лёгка пераканацца, сучасныя паэты не абыходзяць увагаю матывы пачуццёва-эратычнага боку кахання. М. Рудкоўскі адным з першых у берасцейскай паэзіі ўславіў адчуванні будучай маці. З любоўю апісвае паэт цяжарную жанчыну. Лірычнаму герою верша «Цяжарная» здаецца, што яна свеціцца знутры нейкай таямнічаю, загадкаваю прыгажосцю: «У красе мацярынскай – / вялікай, святой – / Яна ў сонцы ідзе. / Я любуюся ёй». Галоўнае прызначэнне жанчыны, на думку паэта, быць маці, выхавальніцай духу дзяцей, а не маткаю па нараджэнні патомства: «… Ча-ла-век… / Убачыць свет ён / праз мукі яе, / Зробіць першы свой крок / праз бяссонне яе, / Потым пойдзе ў дарогу / праз слёзы яе…».

У вершы «Бяссмерце» М. Рудкоўскі разважае аб вялікай таямніцы жыцця: «О таямніца таямніц – зачацце / Травінкі кволай, звера, чалавека!».

Хвіліну з'яўлення новага чалавека на зямлі, якога нараджае ў пакутах жанчына-маці, паэтызуе і А. Каско: «О, як жа трывала ты мукі свае / і як твае рукі цягнуліся ў неба! / Мо гэтак па кроплі сябе аддае / змялелая рэчка засушанай глебе» (верш «О, як жа трывала ты мукі свае…»). Дзяцінства, юнацтва А. Каско прайшло ў маляўнічых мясцінах. Паэт, як сведчыць яго творчасць, здолеў глыбока ўспрыняць унікальнае багацце прыроды. Яго душа пакутуе ад экалагічных зрухаў, што адбываюцца ў краі. Думаецца, таму мукі і перажыванні вагітнай А. Каско параўноўвае з болем змялелай рэчкі, якая па кроплі аддае сябе засушанай глебе, з лёсам яблынькі, што абараняе танюсенькія маладыя пасынкі, каб яны не сталі здабычаю варання. Паэт звяртае ўвагу, што пакуты неабароненай прыроды падобныя да пакут цяжарнай жанчыны. Такім чынам, у вышэй названым вершы пераплятаюцца дзве жыццёва важныя тэмы. Без жанчыны жыццё не мае пастунальнасці, будучыні, але, калі знікне жыццё на Зямлі, усё ўвогуле траціць свой сэнс. Гэтая думка яскрава прасочваецца ў апошніх радках верша. Крыкам немаўля паэт абвяшчае на ўвесь свет, «што ёсць адзіная воля ў любві і ў прыродзе!»

Закранае эратычную тэму паэт А. Дэбіш. У вершы «Трыпціх жаночага цела» ён апісвае «светлы, чароўны міг кахання» – зачацце дзіцяці: «Два целы, што ў адно зліліся на вякі». Плод, што спее ў чэраве жанчыны, – гэта плод надзеі, які «зробіць неўміручым дух твой светлы».

Шкада, што часам «светлы міг кахання» заканчваецца трагічна для жанчыны-маці і немаўлятка застаецца без самага дарагога і самага важнага на свеце чалавека. Боль ахоплівае наша сэрца, калі мы чытаем радкі пра дзіця, што «ў суседнім пакоі заходзіцца енкам» і не могуць «суцешыць суседзі малога» (А. Дэбіш «Ляжыць нерухома на лаве ў святочным убранні»). Не можа ўняць яго плач маці, што «ляжыць нерухома

на лаве ў святочным убранні». Усмешка, якая застыла на твары жанчыны, сведчыць аб блаславеннасці жанчынаю той шчаслівай хвіліны, калі яна падарыла свету новае жыццё. Верш А. Дэбіша «Ляжыць нерухома на лаве ў святочным убранні» сугучны нізцы М. Багдановіча «Каханне і смерць».

Жыццё – мудрая з'ява. Яно вечнае ўваскрашэнне з мёртвых. Мы пойдзем з гэтага свету, знікнем, а пасля нас застануцца дзеці, – нагадваў у свой час чытачу і М. Багдановіч радкамі, што выбіты на магіле жанчыны-маці: «Вучыся паміраць» (верш «Белы крыж, пліта – пад ёй магіла»). Крыж на магіле маці (верш «Смертию смерть поправ») успрымаецца не толькі як сімвал пакут, але і ўдзячнасці за шчасце, дараванае ёй лёсам, – за нараджэнне дзіцяці.

Надзею на адраджэнне і бессмяротнасць духу З. Дудзюк звязвае з вобразам жанчыны-маці. У вершы «Балада пра маці» ўражвае тонкасць, дзівосная праўдзівасць, з якой паэтка прасочвае ахвярны шлях маці. Яна прымае на сябе пакуты, дорыць свайму сыну надзею на выратаванне: «І раптам, нібы вырвала з грудзей, / Як крылы птушка, выпрастала рукі / і палажыла на бялюткі снег / Той найдарожшы, найраднейшы скрутак. / … / Надзея мільганула: будзе жыць. / А ўсё астатняе – зусім не страшна». У баладзе вобраз маці, звычайнай зямной жанчыны, узбуйняецца да вобраза Мадонны. Па глыбіні раскрыцця тэмы кахання і смерці «Баладу пра маці» З. Дудзюк можна суаднесці з творамі Р. Барадуліна, што змешчаны ў зборніку «Евангелле ад мамы», з цыклам М. Багдановіча «Каханне і смерць» са зборніка «Вянок». З. Дудзюк апаэтызавала сам момант смерці Маці, мужнасць жанчыны, якая не аддала сваё дзіця на пакуты, а, падобна Хрысту, прыняла іх сама. «Сляды жанчыны нібы прагарэлі. / Юнак па іх прыходзіць да магілы, / Куды заўчасна маці адышла, / заўчасна рукі любыя злажыла». Услед за класікам беларускай літаратуры сучасныя паэты паказваюць ахвярную смерць маці ў імя працягу жыцця.

Маці заўжды адчувае адказнасць за шчасце-долю свайго дзіцяці з моманту яго зачацця. Лірычная гераіня М. Багдановіча верыць у прыкметы, праклянцце, у магічную сілу слова, дзеянняў (верш «Праклянцце вагітнай»).

Колькі сапраўднай цеплыні, ласкі і пяшчоты чуецца ў замове маці, лірычнай гераіні М. Рудкоўскага (верш «Над хворым дзіцём»), якую яна нашэптвае над хворым «птушаняткам», як ласкава называе гераіня немаўлятка. Ёй хочацца верыць, што з дапамогаю сіл прыроды яна адвядзе боль ад хворага. Моцнае ўражанне робяць апошнія радкі: «Аддай мне свой боль, птушанятка, / Я кіну яго на вецер, / Пушчу на лясы, балоты, / Сама лепей злягу, / Каб толькі было ты, дзіцятка, / Жыва-здарова…». Колькі мужнай самаахвярнасці ў просьбе няшчаснай маладой маці. Варта здзівіцца майстэрству М. Рудкоўскага, які, падобна народным песнярам, адным сказам ёміста ахарактарызаваў мацярынскія пачуцці.

Бясспрэчна, вяршыняй духоўнасці ва ўяўленні беларускага класіка з'яўляецца вобраз Мадонны. Паслядоўнікі М. Багдановіча таксама перакананы, што адносіны да жанчыны – адзін з важных крытэрыяў у ацэнцы той ці іншай цывілізацыі, грамадства, бо імя той, хто дарує ўсім жыццё – Жанчына-Маці. «Преклонение перед женщиной … чуть ли не всегда крупнейшим двигателем было» (М. Багдановіч «Мадонна»).

Нас не можа не радаваць апошнім часам той факт, што паэзія становіцца элітарнай з'явай. Дапытлівы чытач спрабуе знайсці адказы на хвалюючыя пытанні ў паэтычных радках. Светапазнавальныя, маральна-духоўныя пошукі мастакоў слова абумоўліваюць арыгінальную будову твора. Абнаўленне жанравых форм становіцца

працэсам заканамерным, духоўна неабходным як паэту, так і чытачу, прыкметай высокага ўзроўню творчасці пісьменнікаў і ў цэлым літаратуры. На наш погляд, такія гарманічныя жанравыя формы, як санет, трыялет, актава, танка, хоку дапамагаюць мастакам слова згарманізаваць няпросты і шматаблічны свет, сцвярджаць высокія каштоўнасці чалавечага быцця.

Упэўнена крочыць па «забытым шляху» сучаснікам дапамагаюць набыткі М. Багдановіча. У паэтычнай форме пра гэта разважае А. Каско: «Хораша і светла / ў родным храме, / і любоў да спадчыны / расце./ Не прарочу долі: / выспеў час / не гадаць – здзяйсняцца / колькі змогі…» (верш «Багдановічу»).

Урокі М. Багдановіча па выкарыстанні паэтычных форм, якія былі выпрацаваны гісторыяй усходніх паэтычных культур, не засталіся не заўважанымі нашым сучаснікам Я. Збажыной. Паэт удала захоўвае арыгінальную будову верша (трохрадкоўе з кананічнаю колькасцю радкоў 5-7-5). Праца ў жанры хоку актывізуе працэс нараджэння мастаком слова арыгінальных сімвалаў. З вобразам-сімвалам кветкі эдэльвейс мы сустрэліся ў хоку «Рву эдэльвейсы»: «Рву эдэльвейсы. / Водару асфадэляў / Прагне каханне». Жыццесцвярджальны пачатак увасоблены ў кветцы эдэльвейс, што расце высока ў гарах. Суквецце гэтай расліны падобна на белую зорку. У хоку яна ўспрымаецца як зямная пасланніца Зоркі Венеры – багіні кахання. Такім чынам, Ян Збажына паэтызуе прагу кахання, тую жыццёвую сілу, што здымае боль і трагізм быцця і разнявольвае чалавека. Натуральна ўвасабляюцца ў хоку «Рву эдэльвейсы» такія эстэтычныя патрабаванні да гэтага жанру, як «Фуга-но-Макото (апяванне сапраўднай прыгажосці), Югэн (запаветная прыгажосць, глыбіня, неспазнанасць да канца)» [1, с. 6].

Вобраз маладзіка, што высвечваецца ў паэтычным радку «ноч сярпом жне пыл» (хоку «Ноч сярпом жне пыл»), дапамагае адчуць няўтульнасць лірычнага героя Я. Збажыны ў суровай прозе жыцця, паглыбіць узнятую аўтарам праблему суадносін чалавека з касмічнай прасторай. Начны час, калі ён застаецца сам-насам са сваімі думкамі на ўлонні прыроды, не ўзмацняе самоты героя, а дазваляе засяродзіцца на сутнасным у жыцці, зразумець, што за непазбежнасцю наступае пара абнаўлення і квітнення: «Шпурляю глыж у ставок – / Кругі на вадзе». Вера ў мудрую дыялектыку жыцця аказваецца мацнейшай за часовую неўладкаванасць, бытавую мітусню.

Ян Збажына, звярнуўшыся да жанраў танка і хоку, марыў «разняволіць напеўны рыфмаваны верш» [7, с. 3]. Гэта не стала для яго самамэтай. Разняволенне, на наш погляд, адбываецца за кошт узбагачэння паэтычнай лексікі («сненне»: «Каляровая // Нявыказанасць снення»), паглыблення медытатыўных матываў, здольнасці паэта афарыстычна мысліць. Гэта датычыцца не толькі радка, у якім сканцэнтравана з максімальнай сціласцю значная, глыбокая думка (напрыклад, «Засмяглыя – завянуць!»). Па сваёй сутнасці хоку і танка Я. Збажыны афарыстычныя цалкам. У іх у арыгінальнай, па-мастацку дасканалай і запамінальнай форме заключана нечаканая выснова.

У хоку «Эпітафія» слова эпітафія з'яўляецца своеасаблівым сінонімам слова памяць, бо здаўна вядома, што эпітафіі пішуцца для жывых, а для памерлых служаць паніхіды. «Жывым застаюцца помнікі, курганы, магілы, эпітафіі… і слёзы, калі быць шчырымі – слёзы аб сваёй долі, што жыццё збяднела яшчэ на аднаго чалавека. І ўсё для таго, каб ніколі не памірала жывая чалавечая памяць, што і яны жылі на гэтай зямлі, і яны любілі калісьці, і ў іх быў свой зорны час» [ 9, с. 7]. Я. Збажына звяртаецца да людзей, нагадвае ім, што памяць жывых павінна хоць штосьці супрацьпаставіць

няўмольнай смерці, тым больш, смерці нечаканай, раптоўнай. Колькі нявздзейсненых спраў засталося пасля маладога чалавека!.. На такі роздум наводзяць нас паэтычныя радкі з хоку берасцейскага аўтара «Малады нябожчык смерць / Упрыгожвае». Словы з пахавальнага абраду «Вечная памяць! Вечны спакой…» успрымаюцца намі менавіта ў такім жа кантэксце. Прысутныя на пахаванні вымаўляюць іх, у першую чаргу, дзеля тых, хто застаецца жыць на зямлі. У такія хвіліны, як ніколі, людзі адчуваюць сваю паяднанасць з усім чалавецтвам. Такім чынам, у слове «эпітафія» Я. Збажына тонка зашыфраваў медытацыю такіх філасофскіх катэгорый, як жыццё і смерць. М. Танк гэта здолеў зрабіць у слове «нірвана» (хоку «Рэкі, як людзі»), што ў перакладзе з санскрыту азначае згасанне. Заканчвае чалавек свой жыццёвы кругабег, – разважае паэт, каб растварыцца ў акіяне вечнасці.

Заўважана, што жанр хоку спрыяе актыўнаму развіццю індывідуальнага пачатку творцы. «А як вядома, – справядліва адзначае ў кнізе «Сучасная беларуская паэзія» У. Гніламёдаў [3, с. 181], – без свайго я ў літаратуры няма чаго рабіць. Тым больш у паэзіі, дзе арганічная зрошчанасць асобы і таленту вызначае і творчы патэнцыял паэта, і важкасць яго сацыяльна-мастацкіх адкрыццяў, і іх індывідуальную непаўторнасць».

У творчасці японскіх паэтаў на першы план выступае рэфлектыўны бок творчага акта (адлюстраванне і адначасова роздум). Сапраўды, пры напісанні танка ці хоку (скарочаны варыянт танка) актыўна працуе не столькі слоўна-выяўленчая вобразнасць, колькі думка. І гэта адна з прычын звароту Я. Збажыны, творчасць якога належыць да інтэлектуальна-філасофскай плыні, да названага жанру. Магчыма, ён заўважыў, што не ўсё і не заўсёды можа быць вытлумачана свядомасцю чалавека, які часта здзяйсняе ўчынкі на ўзроўні інтуітыўным, эмацыянальным. Адсутнасць рацыянальнага элемента ў творчым працэсе (дарэчы, гэта адзін з эстэтычных канонаў складання хоку) спрыяе творчым азарэнням, працы фантазіі, уважліваму стаўленню да кожнай дробязі.

Безліч думак, асацыяцый нараджае звычайная кропля на сцяне, у якую ўглядаецца паэт з тонкім мастацкім чуццём: «Кропля на сцяне / Утаймоўвае думкі. / Разглядаю іх».

Маленькаю кропляю ў складаным свеце дарослых адчувае сябе немаўля (хоку «Немаўля плачыць»). Для яго бацькоў гэтая кропля ўвасабляе сумную ісціну: жыццё – поле бітвы, рэчаіснасць напоўнена няўмольнымі супярэчнасцямі. Мы не можам быць перакананы ў перамозе дабра над злом, у тым, што радасць перасягне боль. Так заўжды было і будзе, бо калі не – то жыццё спыніцца. На жаль ці на шчасце, дзіця гэтага не разумее. Яно марыць гэтыя непрымірымыя супрацьлегласці згарманізаваць у адзінай жыццёвай кроплі.

Творчасць Я. Збажыны ўзбагачаецца роздумна-медытатыўнымі інтанацыямі. Паэт думае пра вечнае, спрабуе зразумець глыбіннае, сутнаснае. Так, у мастацкай палітры танка «Нябожчык едзе» і хоку «Распранутая / Прыгажуня ў трупярні / Моцна смярдзела» пераважае змрочнасць, панырасць фарбаў. Трапляючы з паэтам у эпіцэнтр бяды, мы адчуваем сябе бездапаможнымі перад тварам смерці: «Нябожчык едзе / На могілкі. Воз трасе / Па калдобінах. / Нязмазаныя колы / Скуголлем рэжуць вушы».

Тужлівы настрой, што пануе ў прыродзе, выклікае ў душы лірычнага героя роспачны настрой і сум, абвастрае пачуццё адзіноты: «Дождж ліў як з вядра. / Парасону ўсё роўна. / Ён спаў на шафе».

Чаму краса недаўгавечная? Чаму каханне нечакана ўзнікае і таксама невядома куды знікае, «як падаючы снег», а ў душы застаюцца сум і адчуванне далучанасці да разумення жыццёвага кругабегу. Гэтыя пытанні Ян Збажына акрэслівае ў хоку «Трачу

прытомнасць». Ён не робіць нават спробы паказаць, як нараджаецца краса, як заяўляе аб сабе ў Сусвеце, а потым нечакана раствараецца ў ім (гэты працэс можна назіраць, напрыклад, у вершы М. Багдановіча «Срэбныя змеі»). Такога падыходу патрабуе абраная Я. Збажыной жанравая форма. Тэма кахання паглыбляецца паэтам у хоку «На шальках вачэй».

Цікава і каштоўна, што ў творах Я. Збажыны арганічна паяднаны агульначалавечыя і нацыянальныя праблемы. У танка «Дзве ружы ў вазе» позірк паэта звернуты да васілька, сціплай палявой кветачкі блакітнага колеру. У ёй увасоблена беларуская душа, якая ў розныя гістарычныя часы пакутавала, але заўсёды з надзеяй імкнулася ў будучыню: «Зайздрошчу яму // і выплюхваю ваду. // Засмяглыя – завянуць!» Апошні радок танка – гэта і сцверджанне, і адначасова перасцярога тым, хто не разумее, што перакройванне свядомасці асобы пачынаецца з нігілістычнага адштурхоўвання таго, што здабыта бацькамі.

З праведзенага аналізу вынікае, што Ян Збажына не ставіць перад сабой мэты ўмешвацца ў жыццёвы працэс, не дае парады, не ўказвае прычыны. Ён спрабуе прыцягнуць увагу чытача да праблемы жыцця і смерці («Смерць вылучае», «Нябожчык едзе»), да разваг аб наканаванасці перамогі хрысціянства над язычніцтвам («Паганскі ідал»), задумваецца аб змесце і сэнсе чалавечага быцця («Немаўля плачыць», «Дна не існуе»). Паэта не пакідае абыякавым тэма адзіноты («Дождж ліў як з вядра»), красы («Трачу прытомнасць»), кахання («На шальках вачэй»), хвалюе вобраз жанчыны («Пішу жанчыну»). Гегелеўская трыяда «тэзіс – антытэзіс – сінтэз» у танка і хоку «спраўджваецца не непасрэдна як у цвёрдых жанравых формах, дзе думку нельга абарваць і даць чытачу дадумаць, бо патрабуецца яе развіццё, працяг і завяршэнне пэўнай высноваі, а ўскосна» [10, с. 37].

Мажліва, для Я. Збажыны, гісторыку па адукацыі, знаёмства з японскай культурай дапамагае выкараніць з ужытку дылетанства як культурны феномен. Думкі паэта аб творчасці ўвасоблены ў хоку «Дна не існуе», якое сугучна перажываннням Р. Крушыны (хоку «Муза, не ўцякай!»). «Шлях да ўласнага» – шлях выпрацоўкі свайго ўласнага стылю, пазнання асаблівасцей літаратурнага працэсу ва ўяўленні паэта не мае межаў («дна не існуе»), але на ім давядзецца паспытаць шмат пакут («бясконцае падзеннне»). Да такіх разважанняў падводзіць нас і Я. Збажына. Адчуць стан душы творцы, калі нельга не пісаць, нягледзячы на розныя перашкоды аб'ектыўнага і суб'ектыўнага плану, дапамагае Р. Крушына праз вобраз «у крыві агонь» («Муза, не ўцякай! / маё сэрца да цябе! / У крыві – агонь»).

Ян Збажына, як сведчыць яго творчасць, здолеў улавіць рытм метамарфоз, што адбываюцца ў Сусвеце, паяднацца душою з даследуемым аб'ектам і адлюстраваць гэта ў сваіх творах. Паэт перакананы, што праз мінімальную колькасць слоў можна дакладней перадаць дзеянне, малюнак, думку, стан душы, стварыць больш дасканалы вобраз. На шляху вырашэння пастаўленай задачы Я. Збажына свядома, мэтанакіравана звярнуўся да жанраў хоку, танка. Бясспрэчна, паэт сваёй творчасцю ў гэтых жанрах прадэманстраваў нам станоўчыя моманты «лаканічнага» пісьма. Я. Збажына, на наш погляд, здолеў далучыць чытача да вырашэння агульначалавечых праблем, напоўніў верш роздумна-медытатыўнымі інтанацыямі, арганічна паяднаў агульначалавечыя і нацыянальныя праблемы, з максімальнай сцісласцю сфармуляваў значную, глыбокую думку.

Відавочна, працягваючы традыцыі М. Багдановіча, сучасныя паэты паспяхова папаўняюць скарбніцу сусветнай культуры, напаўняюць цвёрдыя вершаваныя формы,

якія не атрымалі паўсядзённай прапіскі на беларускай глебе, нацыянальным духам, наглядна паказваюць, як беларускае слова яскрава гучыць у магутнай плыні сусветнай літаратуры.

Праведзены аналіз сведчыць, што ў беларускай паэзіі заўсёды былі нашчадкі вялікага паэта па духу. Традыцыі М. Багдановіча сталі для Н. Мацяш, З. Дудзюк, А. Каско, М. Пракаповіча, М. Рудкоўскага, А. Дэбіша, В. Дэбіша, Я. Збажыны і іншых тою мастацкаю сілаю, уздзеянне якой адчуў на сваёй творчасці не адзін значны талент. І ў той жа час, кожны мастак слова, звярнуўшыся да вызначальных асноў з творчасці беларускага класіка, рухаецца па сваім уласным паэтычным шляху.

Функцыянальнае значэнне літаратурных уздзеянняў рознапланавае. Для адных паэтаў знаёмства з творчасцю М. Багдановіча было штуршком у творчых пошуках (С. Амяльчук, В. Вашэка, Я. Збажына, Р. Бензярук і інш.). Для другіх – адыграла ролю своеасаблівага стымулятара ў вырашэнні ўжо выразна акрэсленых творчых задум (Н. Мацяш, М. Пракаповіч, А. Каско, З. Дудзюк і інш.). Аналіз фактаў сведчыць, што развіваць, узбагачаць літаратурную традыцыю, узнімаць яе да ўзроўню наватарскага (у тэматычных, жанравых, стылёвых, павобразных адносінах) здольны асобы творчыя, шчырыя, таленавітыя, з выразна акрэсленым індывідуальным пачаткам. Да гонару берасцейскіх мастакоў слова неабходна адзначыць, што сувязь паміж крыніцай уздзеяння і паэтам не ператварылася ў пераймальніцтва, у павярхоўную стылізацыю.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Адамчык, У.: Лёс хоку / У. Адамчык // Круглы год: Хоку беларускіх паэтаў. – Мінск: Літаратура, 1996. С. 5–6.
2. Багдановіч, І.: «Бемолі» М. Багдановіча / І. Багдановіч // Крыніца. – 1999. – № 6. – С. 43–49.
3. Гніламёдаў, У.: Сучасная беларуская паэзія: Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс / У. Гніламёдаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 304 с.
4. Гніламёдаў, У.: Яго жыццёвая сіла / У. Гніламёдаў // Полымя. – 1992. – № 4. – С. 226–234.
5. Калеснік, У.: Усё чалавечае / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 381 с.
6. Калеснік, У.: Багдановічава калакагатыя (М. Багдановіч – стваральнік і вартаўнік духоўнай скарбніцы беларускага Адраджэння) / У. Калеснік // Веснік Брэсцкага універсітэта. – 1999. – № 5. – С. 7–11.
7. Каско, А.: Самакаштоўнасць хараства / А. Каско // Заря. – 1996. – 12 декабря. – С. 3.
8. Конан, У.: Святло паэзіі і цені жыцця / У. Конан. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 208 с.
9. Кудласевіч, А.: Memento Mori / А. Кудласевіч // Анталогія беларускай эпітафіі / Уклад., аўт. прадм. І арт. А. Кудласевіч. – Мінск: Ураджай, 2000. – 222 с.
10. Федарцова, Т.: з гісторыі цвёрдых жанравых формаў / Т. Федарцова // Роднае слова. – 2000. – № 12. – С. 37–38.
11. Чабан, Т.: Космас «Вянка». Літаратурны каментарый да «Вянка» Максіма Багдановіча / Т. Чабан // Багдановіч М. Збор твораў: У 3 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1. – С. 463–518.
12. Шамякіна, Т.: Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 400 с.

## Рэзюме

У артыкуле сучасная берасцейская паэзія прадстаўлена як з'ява эстэтычна-непаўторная, гарманічная, самабытная; многія эстэтычныя дасягненні якой абумоўлены плённым засваеннем традыцый класіка беларускай літаратуры М. Багдановіча. Увага акцэнтуецца на своеасаблівасці творча-эстэтычнай трансфармацыі міфалагічных матываў, выяўленні адметнасці рэалізацыі і ўзбагачэння матыву яднання зямной і нябеснай красы, «эстэтыкі зімовай іпастасі быцця» асобы, поліфункцыянальнасці культу жаночай красы. У даследаванні акрэслена значэнне вершаў, якія напісаны ў жанры танка для памнажэння эстэтычных набыткаў беларускай словатворчасці.



## Resumé

Stať je věnována současné brestské poezii jako esteticky unikátnímu, harmonickému a svéráznému jevu. Mnohé estetické hodnoty této poezie byly dosaženy skrze ovládnutí tradic klasika běloruské literatury, M. Bahdanoviče. Pozornost se zaměřuje na osobitost tvůrčí a estetické transformace mytologických motivů, na vyjevení příznačných rysů realizace a obohacování motivu jednoty zemské a nebeské krásy, „estetiky zimní hypostáse bytí" osobnosti, mnohofunkčnosti kultu ženské krasy. Studie se zabývá významy básní, jež jsou napsány v žánru tanka, kdy dochází k zesílení estetické stránky běloruské literární tvorby.